# СА СВЯТАМ ВЯСНЫ, ПРАЦЫ, МІРУ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 15 (615) | Аўторак, 29 красавіка 1986 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

Няхай жыве 1 Мая — Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

(З Заклікаў ЦК КПСС).




## СЛАЎНЫ ЮБІЛЕЙНЫ ПЕРШАМАЙ

**Гарады і вёскі нашай неабсяжнай краіны зноў у святочным убранні. Паўсюдна адчуваецца прыўзняты настрой савецкіх людзей. У абстаноўцы высокага палітычнага і працоўнага ўздыму яны рыхтуюцца адзначыць 1 Мая — Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных. Сёлета ён асаблівы: на нашай планеце ў соты раз людзі розных кантынентаў прадэманструюць сваё яднанне ў барацьбе супраць імперыялізму і рэакцыі, непахіснае імкненне жыць ва ўмовах міру і сацыяльнай справядлівасці.**

**У нашага народа стала выдатнай традыцыяй сустракаць гэта вясновае свята працоўнымі падарункамі. Кожны калектыў напярэдадні Першамая падводзіць вынікі сацыялістычнага спаборніцтва. Кожнага з нас радуе плён ударнай працы будаўнікоў камунізму. Усе мы з вялікім задавальненнем азнаёміліся з паведамленнем ЦСУ СССР аб выкананні дзяржаўных планаў за першы квартал пачатковага года XII пяцігодкі. У цэлым перавыкананы заданні як па аб'ёму вытворчасці, так і па рэалізацыі прадукцыі і росту прадукцыйнасці працы. Гэта з'яўляецца яскравым сведчаннем самаадданасці савецкага народа ў барацьбе за практычнае ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXVII з'езда КПСС.**

**Першамай заўсёды звязаны са словамі «Мір», «Праца», «Шчасце». Захаваць мір на Зямлі, не дапусціць ядзернай катастрофы — самае вострае пытанне нашага часу. Краіна Саветаў, як заўсёды, з'яўляецца апорай усіх міралюбівых сіл, настойліва змагаецца за разрадку міжнароднай напружанасці, усталяванне ўсеагульнага давер'я паміж дзяржавамі з розным сацыяльным ладам, за забарону і паступовае поўнае знішчэнне ядзернай зброі. Савецкія прапановы і ініцыятывы знаходзяць усё больш і больш прыхільнікаў.**

**Як заўжды, дастойна сустрэць свята 1 Мая імкнуўся і шматтысячны калектыў нашага універсітэта — вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся. Сёння нам ёсць чым ганарыцца. Многае робіцца для павышэння якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, пашырэння і паглыблення навуковых даследаванняў, хутчэйшага ўкаранення і павышэння іх эфектыўнасці. Студэнты актыўна рыхтуюцца да новага працоўнага семестра. Яны зноў поўныя рашучасці выйсці ў лік пераможцаў абласнога і рэспубліканскага сацыялістычнага спаборніцтва.**

**Калектыў нашага універсітэта, змагаючыся за ажыццяўленне рашэнняў XXVII з'езда КПСС, прыкладае свае намаганні для дасягнення новых, значна вышэйшых паказчыкаў ва ўсіх сферах дзейнасці.**

**Рэктарат, партком грамадскія арганізацыі універсітэта горача віншуюць выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і аспірантаў са слаўным святам Першамая, жадаюць усім поспехаў у працы і вучобе, моцнага здароўя і вялікага асабістага шчасця.**

**РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, ПРАФКОМ, КАМІТЭТ ЛКСМБ, ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.**

## ВЫСТУПІЛІ ЛАЎРЭАТЫ

У нашым універсітэце, як і па ўсёй краіне, урачыста было адзначана прафесіянальнае свята — Дзень савецкай навукі. Яму прысвячаўся сход вучоных, выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў ГДУ, які адбыўся 18 красавіка.

Уступным словам сход адкрыў прарэктар па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў.

На сходзе з дакладамі выступілі лаўрэаты VIII гадавых навуковых чытанняў, прысвечаных Дню савецкай навукі і 116-ай гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна: загадчык кафедры ВМ і праграміравання доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар В. П. Рубанік, асістэнт кафедры оптыкі кандыдат фізіка-матэматычных навук В. Р. Шолах, старшы навуковы супрацоўнік кафедры фізічнай метралогіі У. У. Сыцько.

Ва ўрачыстай абстаноўцы былі ўручаны ўзнагароды пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва за 1985 год. За першае месца пераходны Чырвоны сцяг ГДУ і Ганаровая грамата ўручана калектыву матэматычнага факультэта. Факультэты — прызёры спаборніцтва, лепшыя кафедры і калектывы іншых структурных падраздзяленняў універсітэта ўдастоены пераходных чырвоных вымпелаў і Ганаровых грамат.

Добры настрой у гэты дзень быў і ў работнікаў універсітэцкай бухгалтэрыі. Яны атрымалі грамату Мінвуза БССР і БРК галіновага прафсаюза за другое месца, занятае ў рэспубліканскім аглядзе стану бухуліку і справаздачнасці бухгалтэрый ВНУ.



**На здымку** (злева направа): сакратар партбюро Л. Я. Палякоў і дэкан матэматычнага факультэта У. Ф. Філіпцоў з пераходным Чырвоным сцягам ГДУ, які ўручыў калектыву матфака прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў за перамогу ў сацыялістычным спаборніцтве.

**Фота У. ЧЫСЦІКА.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектывы кафедр замежных моў горача віншуюць выкладчыка кафедры нямецкай і французскай моў СІЛІНА Уладзіміра Васільевіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.**

* * *

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-філалагічнага факультэта, кафедра рускай літаратуры горача віншуюць асістэнтаў гэтай кафедры ТОЛЧЫКАВУ Людмілу Іванаўну і НЕНАДАЎЦА Аляксея Міхайлавіча з паспяховай абаронай кандыдацкіх дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.**

## У СЭРЦАХ З ІЛЬІЧОМ

**Ва універсітэце ўрачыста адзначана 116-я гадавіна з дня нараджэння У. І. Леніна. Да яго помніка ля вучэбнага корпуса № 2 былі ўскладзены вянкі і кветкі, светлай памяці правадыра сусветнага пралетарыяту, стваральніка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы прысвяцілі шырокую праграму ў свае традыцыйныя дні студэнты біяфака.**

## ПРЫЗНАНЫ ПЕРАМОЖЦАМІ

**Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва камсамольскіх арганізацый Цэнтральнага раёна г. Гомеля па выкананню рашэнняў XXVI з'езда КПСС камсамольская арганізацыя нашага універсітэта выйшла пераможцай. Ёй прысуджаны памятны чырвоны вымпел РК ЛКСМБ, які ва ўрачыстай абстаноўцы быў уручаны 21 красавіка на сходзе камсамольска-прафсаюзнага актыву ГДУ.**

## ТЫДЗЕНЬ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ

**Напярэдадні Першамайскага свята ў нашым універсітэце быў праведзены Тыдзень студэнцкіх атрадаў. У яго праграму ўваходзілі конкурсы агітбрыгад, лектараў і конкурс на лепшае афармленне лагера. Ва ўсіх іх найбольш вызначыліся студэнты біялагічнага факультэта. Добрую падрыхтаванасць да новага працоўнага семестра паказалі будучыя матэматыкі і выхаванцы іншых факультэтаў.**

## БАГАЦЦЕ ТАЛЕНТАЎ

**У нашым горадзе стаў традыцыйным фестываль «Студэнцкая вясна». Гэта свята, на якім вызначаюцца лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці гомельскіх ВНУ. На гэты раз агляд праходзіў у актавай зале БІІЧТу. Журы адабрала для заключнага канцэрта 21 нумар, адзінаццаць з якіх прадстаўлялі самадзейныя артысты нашага універсітэта. Асабліва высока адзначана выканаўчае майстэрства вакальнай групы ў складзе Т. Парэмскай, І. Кузьміной, С. Прэдка, М. Барысавай, чытальніцы і выканаўцы песень Л. Міхаленка.**

**(Наш кар.).**

**КАМСАМОЛЬЦЫ, ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! БУДЗЬЦЕ ЗАСТРЭЛЬШЧЫКАМІ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА УСЁ НОВАЕ, ПЕРАДАВОЕ Ў НАШЫМ ЖЫЦЦІ!** (З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1986 г.)

*Са сходу камсамольска-прафсаюзнага актыву*

# НА ВЕРНАСЦЬ ЛЕНІНСКІМ ЗАПАВЕТАМ

21 красавіка ў актавай зале адбыўся сход камсамольска-прафсаюзнага актыву універсітэта. Па дакладу сакратара камітэта ЛКСМБ **Вячаслава Асіпенкі** абмеркавана пытанне «Аб выніках XXVII з'езда КПСС і задачах камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый універсітэта па выкананню яго рашэнняў».

Пры абмеркаванні даклада выступілі: сакратар камітэта камсамола гісторыка-філалагічнага факультэта **Юрый Пенязь**, член камсамольскага бюро біялагічнага факультэта **Алена Маладзякова**, студэнт 3-га курса фізічнага факультэта **Юрый Зотаў**, студэнт 3-га курса гістфіла, камандзір аператыўнага камсамольскага атрада дружыннікаў універсітэта **Аляксандр Дрозд**, старшыня прафкома студэнтаў ГДУ **Н. І. Колтышава**, студэнт 5-га курса гістфіла, старшыня ВВК прафкома студэнтаў **Віктар Яцухна**, старшыня студсавета інтэрната № 2 **Ганна Базылёва**, загадчык кафедры палітэканоміі дацэнт **У. Ф. Бондараў**.

У рабоце сходу камсамольска-прафсаюзнага актыву прынялі ўдзел прарэктар універсітэта па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР **Л. А. Шамяткоў**, які выступіў пры абмеркаванні даклада, намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце дацэнт кафедры палітэканоміі **Г. Д. Ветлугаеў**, загадчыца аддзела камсамольскіх арганізацый Цэнтральнага РК ЛКСМБ **Ірына Кузьменка**.

Па абмеркаванаму пытанню на сходзе прынята пастанова, у якой поўнасцю і цалкам адобраны рашэнні XXVII з'езда КПСС і прыняты да няўхільнага кіраўніцтва і практычнага выканання. Зацверджаны арганізацыйна-палітычныя мерапрыемствы камітэта камсамола і прафкома студэнтаў ГДУ па выкананню рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

АСНОЎНАЯ задача камітэта камсамола і прафкома студэнтаў у святле патрабаванняў XXVII з'езда КПСС, падкрэслівалася на сходзе актыву, — выпрацаваць у моладзі арганічную патрэбу ў авалодванні сучаснымі ведамі. У гэтай сувязі неабходна ўзмацніць увагу да паспяховасці студэнтаў, наведвання імі заняткаў, разумнаму выкарыстанню свайго часу.

У дакладзе быў выказаны папрок у адрас камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый эканамічнага факультэта, дзе за апошнія гады прыкметна знізіўся ўзровень паспяховасці студэнтаў. Аднак тут не прымаюць рашучых мер да прагульшчыкаў, усіх тых, хто пасля кожнай сесіі мае запазычанасці і не імкнецца ліквідаваць іх ва ўстаноўлены тэрмін.

Не змагаюцца па-сапраўднаму за ўзорную вучэбную дысцыпліну і на фізічным факультэце. Тут таксама ігнарыруюць прынятае на папярэднім сходзе камсамольска-прафсаюзнага актыву рашэнне аб прыцягненні да строгай адказнасці студэнтаў за пропускі заняткаў без уважлівых прычын.

Трэба браць прыклад з матэматычнага, гісторыка-філалагічнага і біялагічнага факультэтаў, дзе самым сур'ёзным чынам узяліся за навядзенне парадку і дысцыпліны, глыбокае авалодванне кожным студэнтам ведамі, каб стаць высокакваліфікаваным спецыялістам.

Сёння вельмі важным фактарам з'яўляецца ўдзел кожнага юнака і дзяўчыны ў навукова-даследчай рабоце. Ёй ахоплена ва універсітэце пераважная большасць студэнтаў. Аднак іх навуковая думка, творчы пошук павінны пастаянна развівацца і расці, дасягаць усё больш значных вынікаў. Трэба актыўней укараняць у вытворчасць і вучэбны працэс студэнцкія навуковыя распрацоўкі і вынаходніцтвы.

На сходзе актыву першаступеннае значэнне надавалася важным і адказным задачам, пастаўленым XXVII з'ездам КПСС па ідэйна-палітычнай, працоўнай і маральнай загартоўцы моладзі. У гэтай справе ўжо накоплены добры вопыт у асобных акадэмічных групах гісторыка-філалагічнага, матэматычнага і некаторых іншых факультэтаў. Яго неабходна абагульняць і ўсямерна пашыраць.

Вялікую дапамогу ў справе павышэння сацыяльнай актыўнасці студэнцкай моладзі павінен аказваць факультэт грамадскіх прафесій. Аднак у апошнія гады ў яго дзейнасці назіраецца некаторы спад. У будучым гэта недапушчальна. Трэба зрабіць рашучы паварот у актывізацыі і павышэнні эфектыўнасці работы ФГП.

У дакладзе і выступленнях належнае асвятленне знайшлі і пытанні ўдзелу студэнтаў універсітэта ў ажыццяўленні рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы, у шматграннай шэфскай рабоце, у падрыхтоўцы і ўзорным правядзенні новага працоўнага семестра.

Камсамольская і прафсаюзная арганізацыі універсітэта прыкладаюць шмат намаганняў для ўсталявання ў студэнцкім асяроддзі цвярозага, здаровага ладу жыцця, добрага быту. Дасягнуты ўжо пэўныя вынікі. Ва універсітэцкую арганізацыю таварыства барацьбы за цвярозасць уступіла 293 камсамольцы, на гістфіле і факультэце фізвыхавання з'явіліся акадэмічныя групы, якія аб'явілі цвярозасць нормай свайго жыцця. За апошні час узніклі новыя клубы і аб'яднанні па інтарэсах, дзе можна цікава і з вялікай для сябе карысцю правесці вольны час. Але гэта толькі пачатак вялікай мэтанакіраванай работы, бо пазбавіцца ад усіх негатыўных з'яў — справа не з лёгкіх. Пацвярджэннем таму адна лічба: у бягучым навучальным годзе за амаральныя ўчынкі выключана з універсітэта 13 студэнтаў. Значыць, у выхаваўчай рабоце яшчэ не здолелі дайсці да кожнага чалавека, мелі месца істотныя ўпушчэнні.

На сходзе было шмат сказана аб карэннай перабудове камсамольскай і прафсаюзнай работы ў святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС, аб пошуках новых эфектыўных яе форм і метадаў, аб павышэнні персанальнай адказнасці кожнага камсамольца і члена прафсаюза за ўзровень сваёй прафесіянальнай падрыхтоўкі, жыццёвай пазіцыі, выкананне даручаных спраў.

Удзельнікі сходу камсамольска-прафсаюзнага актыву выказалі цвёрдую ўпэўненасць у тым, што камсамольцы, уся моладзь універсітэта не пашкадуюць сіл для практычнага ажыццяўлення рашэнняў XXVII з'езда КПСС, паспяховай вучобай і навуковым пошукам, самаадданай працай і актыўнай грамадскай работай пацвердзяць сваю вернасць бессмяротнаму ленінскаму запавету «Вучыцца камунізму!»

**Б. ВАЛОДЗІН.**

*На камуністычным суботніку*

# ДРУЖНА, ЭНЕРГІЧНА

Іменна так працавалі студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі нашага універсітэта на Усесаюзным камуністычным суботніку, прысвечаным 116-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Свае сілы яны прыклалі на многіх аб'ектах горада, у саўгасе «Хальч», на добраўпарадкаванні стадыёна, паркаў, у вучэбных карпусах і інтэрнатах, аказалі дапамогу работнікам музея народнай творчасці г. Веткі.

Змешчаныя на гэтай старонцы фотаздымкі былі зроблены 19 красавіка.





**У цукерачным цэху кандытарскай фабрыкі «Спартак» старанна разам з іншымі выкладчыкамі і супрацоўнікамі эканамічнага факультэта працавалі дацэнт кафедры галіновых эканомік Л. С. Лазучэнкава і асістэнт гэтай жа кафедры Н. В. Волкава.**



**Супрацоўнікі фізічнага факультэта вядуць раскопку падземных камунікацый на пляцоўцы, дзе будзе ўзводзіцца новы вучэбны корпус універсітэта.**



**Студэнты на пабелцы дрэў.** **Фота Н. Кір'янавай.**

*З гісторыі святкавання 1 Мая на Гомельшчыне*

# УРОК МУЖНАСЦІ І БАРАЦЬБЫ

1 МАЯ бягучага года споўніецца 100 гадоў з дня падзей у горадзе Чыкага, якія паклалі пачатак узнікненню міжнароднага свята салідарнасці працоўных усяго свету. У гэты дзень у 1886 г. дэманстрацыя рабочых Чыкага, якія патрабавалі 8-гадзіннага працоўнага дня і паляпшэння ўмоў працы, была расстраляна паліцыяй.

У знак салідарнасці з рабочымі гэтага горада ў ліпені 1889 г. рашэннем Парыжскага кангрэсу II Інтэрнацыянала і быў устаноўлен дзень 1 Мая, як свята рэвалюцыйнага пралетарыяту ўсяго свету і баявога агляду сіл працоўных.

У 1890 годзе гэта свята было ўпершыню адзначана рабочым класам ЗША і большасці краін Еўропы, у тым ліку і Расійскай імперыі. Усяго з адставаннем у пяць гадоў ад галоўных рабочых цэнтраў царскай Расіі першамайскае свята ўвайшло ў жыццё рэвалюцыйнага пралетарыяту Беларусі. Ужо ў 1895 г. разам з працоўнымі многіх гарадоў Расіі Першае мая адзначалі рабочыя Мінска, Гродна, Смаргоні. А затым гэта свята стала адзначацца ў многіх гарадах і мястэчках усёй Беларусі, у тым ліку і Гомельшчыны як дзень міжнароднай пралетарскай салідарнасці.

У 1897 годзе гомельская сацыял-дэмакратычная група ў дзень 1 Мая правяла нелегальны сход пад лозунгамі: «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!», «Далоў самадзяржаўе!», «Няхай жыве сацыялізм!». На наступны год у першамайскай масоўцы, праведзенай у лесе пад Гомелем, прынялі ўдзел 200 чалавек. Яны спявалі рабочую «Марсельезу» і іншыя рэвалюцыйныя песні

У першамайскіх святах 1899 і 1900 г. г. удзельнічала яшчэ большая колькасць рабочых. Першае мая становіцца традыцыйным святам рабочых Гомельшчыны, якое праходзіла пад знакам барацьбы за свае палітычныя правы і паляпшэнне матэрыяльнага становішча.

З высокай актыўнасцю на Гомельшчыне было праведзена першамайскае свята 1901 года. У Гомелі ў гэты дзень адбыліся палітычная стачка, шматлюдны мітынг і дэманстрацыя на Румянцаўскай (цяпер Савецкай) вуліцы. Гэта было першае палітычнае выступленне рабочага класа Палескага раёна. У час гэтай дэманстрацыі яе ўдзельнікі віталі смелы ўчынак свайго земляка, вязня Шлісельбургскай крэпасці студэнта Пятра Карповіча, які ў лютым 1901 г. застрэліў рэакцыйнага міністра асветы Н. П. Багалепава. Дэманстрацыя была разагнана паліцыяй.

У 1903 і 1904 г. г. у дзень І Мая палітычныя стачкі і дэманстрацыі прайшлі ў Гомелі, Мазыры, Рэчыцы і іншых гарадах і мястэчках Палесся, пры гэтым месцамі адбыліся ўзброеныя сутыкненні рабочых з войскамі і паліцыяй. У майскія дні 1904 г. у Гомелі баставала звыш 700 рабочых.

На новую вышыню святкаванне І Мая ўзнялося ў гады Першай рускай рэвалюцыі. У дзень І Мая 1905 года ў Гомелі, нягледзячы на тое, што на вуліцах знаходзіліся ўзмоцненыя нарады паліцыі і казакаў, адбылася шматлюдная дэманстрацыя працоўных на Кузнечнай (цяпер Інтэрнацыянальнай) вуліцы. Не працавалі ўсе прадпрыемствы і майстэрні. Масавыя выступленні працоўных у гэты дзень адбыліся ў Мазыры, Рагачове і іншых гарадах і мястэчках. Асноўнымі заклікамі першамайскіх дэманстрацый 1905 г. былі лозунгі: «Далоў царскае самадзяржаўе!», «Далоў вайну, далоў капіталізм!».

У 1906 г. у першамайскай забастоўцы прынялі ўдзел рабочыя 40 гарадоў і мястэчкаў Беларусі, у тым ліку Гомеля, Мазыра, Рэчыцы, Рагачова. У Гомелі баставала да 90% прамысловых і рамесных рабочых. Па закліку бальшавікоў у гэты дзень адбыліся палітычныя стачкі.

Буйнымі палітычнымі выступленнямі рабочага класа азнаменавалася першамайскае свята 1907 года. У гэты дзень баставала большасць рабочых Гомеля, Рагачова, Рэчыцы і іншых рабочых цэнтраў Палесся. Да забастоўшчыкаў далучыліся прыказчыкі і хатнія работніцы.

Паражэнне рэвалюцыі 1905—1907 г. г. на некаторы час спыніла нарастанне палітычнай барацьбы рабочага класа. Але ўжо пачынаючы з 1911 года святкаванне дня інтэрнацыянальнай салідарнасці рабочага класа зноў набірае сілу. Так, у 1911 г. у Гомелі былі праведзены маёўкі з агульнай колькасцю ўдзельнікаў каля 200 чалавек, а дзень І Мая 1912 г. азнаменаваўся ўжо ўсеагульнай забастоўкай рабочых горада і дэманстрацыяй, у якой удзельнічала звыш 2 тыс. чалавек. Яшчэ з большай актыўнасцю прайшлі першамайскія святы

## АБ СВЯТОЧНЫХ УРАЧЫСТАСЦЯХ

Сёння ў актавай зале адбудзецца ўрачысты сход калектыву універсітэта, прысвечаны Першамаю — Дню міжнароднай салідарнасці працоўных.

Пачатак сходу ў 19 гадзін.

1-га мая прадстаўнікі ўсіх факультэтаў універсітэта прымуць удзел у першамайскай дэманстрацыі працоўных ардэнаноснага Гомеля. Збор — з 8.30 мінут па факультэтах, пастраенне зводнай калоны — у 9 гадзін каля галоўнага корпуса ГДУ.

## ПАРАДНЁНЫЯ НАЗАЎСЁДЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

У савецкім павільёне дэманстравалася і прадукцыя «Гомсельмаша». А вядучая ВНУ Паўднёвай Чэхіі — Вышэйшая сельскагаспадарчая школа — партнёр нашага універсітэта па студэнцкіх сувязях.

Буйнейшая новабудоўля Чэхаславакіі — збудаванне АЭС — таксама разгорнута ў паўднёвачэшскім краі.

Гомель і Паўднёвую Чэхію звязваюць інтэнсіўныя кантакты — эканамічныя і культурныя. Толькі ў нашым горадзе 27 прадпрыемстваў і арганізацый — калектыўныя члены Таварыства савецка-чэхаславацкай дружбы, а ўсяго іх у вобласці—85. Яны ўстанавілі сувязі з 41 роднасным калектывам у ЧССР. Але галоўнае — мост дружбы, які звязвае дзве вобласці, зрабіў для жыхароў Паўднёвай Чэхіі блізкай усю нашу Беларусь, беларускую культуру, а гамяльчан зблізіў з братняй Чэхаславакіяй.

**Т. МАСЛЮКОЎ,**
студэнт гр. Г-51 гісторыка-філалагічнага факультэта.



**На здымку:** Вацлаўская плошча — цэнтр Прагі, пабраціма Масквы. Тут знаходзяцца цэнтральныя арганізацыі Саюза чэхаславацка-савецкай дружбы.

## І ЗНОЎ ПРЭМ'ЕРА

Для студэнцкага народнага тэатра ГДУ «Люстэрка» вечар 21-га красавіка быў надзвычай хвалюючым і адказным. Яго ўдзельнікі выносілі на суд гледачоў сваю чарговую работу — спектакль па сатырычнай аповесці-казцы В. Шукшына «Пункт погляду».

Праца над ім пачалася ў лістападзе мінулага года. Нялёгка было рабятам сумяшчаць вучобу і рэпетыцыі, самім рыхтаваць дэкарацыі і г. д. Але ўсе працавалі над спектаклем з энтузіязмам, захапленнем. Другі раз звярнуліся ўдзельнікі студэнцкага тэатра універсітэта да творчасці В. Шукшына. Чаму менавіта п'есы гэтага аўтара любяць ставіць на сцэне студэнты ГДУ? На гэта пытанне даў адказ рэжысёр народнага тэатра «Люстэрка» А. М. Бычкоў: — Ёсць у В. Шукшына праўда жыцця, Шукшын — наш боль, сугучча сэрцаў. Яго творы не пакідаюць абыякавымі нас, прымушаюць задумацца над жыццём. Героі В. Шукшына пастаянна ў руху, у барацьбе з раўнадушшам, інертнасцю, у пошуках праўды жыцця. Таму і для студэнтаў гэтая тэма найбольш блізкая.

І вось прэм'ера. Актавая зала перапоўнена. Паўтары гадзіны акцёры жылі жыццём сваіх герояў, рашалі іх праблемы, спрачаліся, жартавалі, а гледачы суперажывалі з імі. Хочацца адзначыць выканаўцаў галоўных роляў: Ю. Марціновіча (Аптыміст), В. Антоненку (Песіміст), А. Скрыпкіна (Чароўны чалавек).

«Малайцы, рабяты!» — так ацанілі гледачы новую работу акцёраў студэнцкага народнага тэатра ГДУ.

**Н. КІР'ЯНАВА,**

## *Юбілей вучоных* ПІЯНЕР РАСІЙСКАЙ ГІСТОРЫІ

У красавіку навуковая грамадскасць нашай краіны адзначае буйную дату — 300-гадовы юбілей з дня нараджэння выдатнага рускага гісторыка і дзяржаўнага дзеяча Васіля Мікітавіча Тацішчава (1686 — 1750).

Біяграфія гэтага шырока вядомага чалавека цесна пераплецена з пераломнай эпохай у гістарычным лёсе Расіі часоў пятроўскіх пераўтварэнняў. Малады пскоўскі дваранін удзельнічаў у Паўночнай вайне са Швецыяй, выконваў важныя ваенна-дыпламатычныя даручэнні Пятра I, пазней кіраваў казёнымі заводамі на Урале і ў Сібіры, заснаваў буйны прамысловы цэнтр — г. Екацерынбург (цяпер Свярдлоўск).

Жыццёвы шлях В. М. Тацішчава мала паходзіць на біяграфіі вучоных—тэарэтыкаў. Паплечнік Пятра I, ён перш за ўсё практычнымі справамі зацвярджаў сваю адданасць грамадскім інтарэсам, садзейнічаў эканамічнаму і культурнаму прагрэсу Расіі. Менавіта гэтая дзейнасць вызначыла шырокае кола навуковых інтарэсаў В. М. Тацішчава. Валодаючы шырокімі ведамі ў інжынернай і горнай справе, матэматыцы, геаграфіі, юрыспрудэнцыі, ён абагуліў іх у першым рускім энцыклапедычным слоўніку («Лексіон Расійскі») і радзе навуковых трактатаў.

Аднак найбольш ярка і значна праявіліся талент і эрудыцыя В. М. Тацішчава ў галіне гісторыі. Як патрыёт сваёй Радзімы, ён лічыў адной з галоўных задач барацьбу з яе заходнімі ганьбавальнікамі, якія сцвярджалі, што Расія «гісторый старажытных не мела». Сакрушальны ўдар па гэтых выдумках нанесла «Гісторыя Расійская з самых старажытнейшых часоў» — першая абагульняючая навуковая праца па айчыннай гісторыі. Ёй Тацішчаў аддаў амаль 30 гадоў свайго жыцця, увесь магутны талент і энергію даследчыка. Для XVIII стагоддзя тацішчаўская «Гісторыя» — з'ява выключная не толькі па шматлікасці ўпершыню сабраных фактаў, але і па свайму філасофскаму і грамадска-палітычнаму значэнню. Гэта праца пранізана ідэяй пошуку заканамернасці гістарычнага працэсу. В. М. Тацішчаў адмаўляецца ад біблейска-клерыкальных «аргументаў» і выступае як мысліцель-рацыяналіст, які звязваў ход гісторыі з развіццём «сусветнай розумаасветы». Вучоны даў агульную перыядызацыю гісторыі Расіі, грунтоўна даследаваў яе пачатковыя этапы, паставіў праблему ўзнікнення дзяржаўнай улады.

Аўтар так і не ўбачыў выхаду ў свет сваёй галоўнай працы. Аднак «Гісторыя Расійская» працягвала жыць, на ёй фарміравалася выдатная плеяда вучоных — М. В. Ламаносаў, І. М. Балцін, рускія асветнікі XVIII ст. Па слядах першапраходца ішоў яго пераемнік М. М. Карамзін. І сёння праца В. М. Тацішчава захоўвае сваё непераўзыходзячае значэнне як самага каштоўнага помніка гісторыяграфіі і айчыннай культуры, як прадмет законнай гордасці ўдзячных нашчадкаў.

**Г. АЛЯКСЕЙЧАНКА,**
асістэнт кафедры гісторыі СССР і БССР.

# ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ ГДУ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ

## СТУДЭНТАЎ НА 1986—1987 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

**ПА НАСТУПНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ**

**беларуская і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура, гісторыя, біялогія, фізічнае выхаванне, матэматыка, эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.**

Прыём заяў на спецыяльнасці беларуская і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура, гісторыя, біялогія, фізічнае выхаванне, матэматыка — **з 20 красавіка па 31 мая;** на спецыяльнасці эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — **з 20 красавіка па 31 жніўня.**

Уступныя экзамены на спецыяльнасці беларуская і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура, гісторыя, фізічнае выхаванне, біялогія, матэматыка — **з 1 па 20 чэрвеня;** на спецыяльнасці эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — **з 1 па 15 верасня.**

Залічэнне ў састаў студэнтаў на спецыяльнасці беларуская і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура, гісторыя, біялогія, фізічнае выхаванне, матэматыка — **з 21 па 30 чэрвеня;** на спецыяльнасці эканоміка працы, арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфарматыкі — **з 16 па 20 верасня.**

Паступаючыя ва універсітэт здаюць уступныя экзамены ў залежнасці ад абранай спецыяльнасці па наступных дысцыплінах:

на спецыяльнасць беларуская і руская мова і літаратура — беларускай мове і літаратуры (вусна), грамадазнаўству, рускай мове і літаратуры (пісьмова);

на спецыяльнасць руская мова і літаратура — рускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), грамадазнаўству;

на спецыяльнасць гісторыя — (рускай мове і літаратуры (пісьмова), гісторыі СССР (вусна), грамадазнаўству;

на спецыяльнасць матэматыка — матэматыцы (пісьмова), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова);

на спецыяльнасць эканоміка працы — матэматыцы (пісьмова), рускай мове і літаратуры (пісьмова), грамадазнаўству;

на спецыяльнасць арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — па матэматыцы (пісьмова), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова);

на спецыяльнасць біялогія — біялогіі, матэматыцы (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова);

на аддзяленне фізічнага выхавання — па спецыльнасці (лёгкая атлетыка, гімнастыка, плаванне), біялогіі, рускай мове і літаратуры (пісьмова).

Узнагароджаныя па заканчэнні сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём, скончыўшыя сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову або прафтэхвучылішча з дыпломам з адзнакай, здаюць адзін з устаноўленых для адпаведнай спецыяльнасці ўступных экзаменаў (устаноўлены парадак распаўсюджваецца толькі на асоб, якія маюць стаж практычнай работы па выбранай у ВНУ або роднаснай спецыяльнасці і працуючыя ў цяперашні час), а іменна:

па спецыяльнасці беларуская і руская мова і літаратура — беларускай мове і літаратуры (вусна);

па спецыяльнасці руская мова і літаратура — рускай мове і літаратуры (вусна);

па спецыяльнасці гісторыя — па гісторыі СССР;

на аддзяленне фізічнага выхавання — па біялогіі;

па спецыяльнасці матэматыка — матэматыцы (пісьмова);

па спецыяльнасці арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі — па фізіцы;

па спецыяльнасці біялогія — па біялогіі;

па спецыяльнасці эканоміка працы — па грамадазнаўству.

Пры здачы экзаменаў з адзнакай «пяць» абітурыент вызваляецца ад здачы астатніх экзаменаў, а пры атрыманні адзнакі «чатыры» або «тры» здае астатнія экзамены.

Уступныя экзамены праводзяцца па праграмах, зацверджаных Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР у адпаведнасці з праграмай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы.

Пасля правядзення субяседавання па рашэнню прыёмнай камісіі вызваляюцца ад уступных экзаменаў настаўнікі (выкладчыкі), выхавацелі, якія маюць адпаведную сярэднюю спецыяльную адукацыю і стаж педагагічнай работы не менш года, накіраваныя органамі народнай або прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі на вучобу па роднаснай спецыяльнасці (паступаючыя на спецыяльнасць «фізічнае выхаванне» здаюць экзамен па спецыяльнасці).

У першую чаргу залічваюцца асобы, вызваленыя ад уступных экзаменаў або іх далейшай здачы, а таксама асобы, якія карыстаюцца правам пазаконкурснага залічэння.

Па выніках здачы ўступных экзаменаў спачатку праводзіцца конкурс сярод зволеных у запас ваеннаслужачых, выпускнікоў сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных устаноў, якія паступаюць на роднасныя спецыяльнасці, асоб, што маюць стаж практычнай работы па выбранай спецыяльнасці не менш года, а таксама накіраваных на вучобу ў адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 3 верасня 1966 г. № 729.

На астатнія месцы праводзіцца конкурс сярод асоб, характар работы якіх не адпавядае выбранай спецыяльнасці або маючых стаж работы па выбранай спецыяльнасці менш года.

Заява аб прыёме падаецца на імя рэктара універсітэта па адзінай форме (дадатак № 2 да Правілаў прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы СССР). Да заявы прыкладваюцца: дакумент аб сярэдняй адукацыі (у арыгінале), характарыстыка для паступлення ў ВНУ з апошняга месца работы або вучобы з пячаткай прадпрыемства, установы, арганізацыі, выпіска з працоўнай кніжкі, завераная гербавай пячаткай, медыцынская даведка па форме № 086-У, 6 фатакартак (здымкі без галаўнога ўбора памерам 3x4 см). Пашпарт і дакумент аб адносінах да воінскай павіннасці паступаючыя прад'яўляюць у прыёмную камісію па прыбыцці ва універсітэт.

Дакументы накіроўваць па адрасу: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 108, універсітэт, прыёмнай камісіі, т. 57-11-15.

Яўка на ўступныя экзамены — па выкліку універсітэта.

**РЭКТАРАТ.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат эканамічнага факультэта, кафедра ТСАЭІ выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту ДАВЫДАВУ Уладзіміру Сямёнавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці БАЦЬКІ.**

АЗ 23400

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.

Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

Заказ 321.